Орёл О.О., магистрант
заочной формы обучения
Научный руководитель – Кнатько Ю.И.,
кандидат культурологии, доцент

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД ДА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ТЭРМІНАЎ «АРХЕТЫП» І «АРХЕТЫПІЧНЫ ВОБРАЗ»

Тэма архетыпаў застаецца надзвычай папулярнай у розных праявах сучаснай масавай культуры: у жывапісе, літаратуры, міфалогіі, музыцы, персанальным брэндынгу, рэкламных камунікацыях. Архетыпы могуць дапамагчы зразумець выразы культуры і чалавечы досвед, бо яны выкарыстоўваюць універсальныя мадэлі, агульныя для ўсіх людзей. Падчас распазнавання архетыпаў, чалавек атрымоўвае уяўленне пра ўласныя паводзіны і эмоцыі, а таксама пра паводзіны і эмоцыі іншых. У публікацыях, курсах і артыкулах на дадзеную тэму часцей за ўсе паняцце «архетып» і «архетыпічны вобраз» зліваюцца ў адно цэлае і практычна не дыферэнцуюцца. Актуальнасць артыкула абумоўлена патрэбай вызначэння дэфініцый, пошукам агульнага і рознага для карэктнай інтэрпрэтацыі і ўжывання іх ў наступных даследаваннях. Мэта артыкула – вызначыць дэфініцыі «архетып» і «архетыпічны вобраз».

Канцэпцыя архетыпаў у тым ці іншым выглядзе, як і большасць філасофскіх ідэй, упершыню разглядалася яшчэ ў антычнасці, такімі філосафамі, як Платон, Платын, Цыцэрон, Пліній. Выраз «архетып» сустракаецца ўжо ў Філона Юдэя ў адносінах да Imago Dei у чалавеке. Таксама і ў Ірынея, дзе гаворыцца: «Творца свету не з самога сябе стварыў гэта, ён перанёс з чужых яму архетыпаў». Апроч таго, архетып некалькі разоў сустракаецца ў Дыянісія Арэапагіта, напрыклад у яго працы «De caelesti hierarchia» [3]. У Аўгусціна Блажэннага слова архетып не сустракаецца, але яго замяняе «ідэя». У яго працах прасочваецца разварот да асобы і яе ўнутранага свету. Архетыпы тут выступаюць як мадэлі і ідэі, гэтак значыць

калектыўныя ўяўленні, якія хаваюцца ў глыбінях ўнутранага свету [2]. З вучэння Платона аб эйдасах мы ведаем аб ідэальных бачных прататыпах ўсіх рэчаў, яккія ляжаць у пачатку ўсёй лініі мыслення, лічыць архетыпы своеасаблівымі метафізічнымі ідэямі або мадэлямі, за якімі хаваюцца іх цені - рэальныя рэчы. Падобныя да архетыпаў канцэпты таксама сустракаюцца ў Плоціна. Ен апісвае такім чынам першапачатак свету і першаасновы яго станаўлення. Свой уклад у тэорыю архетыпаў ўнеслі схаластыкі (Іаан Эрыўгена, Тамаш Аквінскі). Схаластыкі лічылі, што архетыпы з'яўляюцца натуральнымі вобразамі чалавечага розуму і дапамагаюць яму прыходзіць да таго ці іншага меркавання. Сярод заходнееўрапейскіх аўтараў вылучаюцца работы І. Канта, які у апісаў трансцэндэнтальныя канцэпты, чый аб'ект не можа быць знойдзены ў вопыце і ў якіх змяшчаецца правобраз усялякага практычнага прымянення розуму. Магчымасць ведаў аб аб'екце на падставе апрыёрных паняццяў рэалізуецца толькі ў сінтэтычнай дзейнасці, якая характарызуецца злучэннем досведавага (свядомага) матэрыялу з апрыёрнымі элементамі (архетыпамі) [2].

Далей архетыпы сустракаюцца ў французскіх філосафаў Э. Дзюркгейма і Л. Леві-Бруля і павязаны з паняццем «representstions collectives» (фр.«калектыўныя ўяўленні»). Люсьен Леві-Бруль выкарыстоўваў гэты тэрмін для пазначэння сімвалічных фігур у першабытным светапоглядзе. Для Эміля Дзюркгейма калектыўныя ўяўленні былі сукупнасцю вераванняў і пачуццяў, што аб'ядноўваюць усіх членаў той ці іншай супольнасці і ўтвараюць своеасаблівую сістэму. Знайсці водгукі архетыпаў можна і ў О. Шпэнглера і яго тэорыі прасімвалаў. Прасімвал, паводле О. Шпэнглера – штосьці, што ў прасторава-пачуццёвай форме выяўляе непаўторную своеасаблівасць душы культуры ў яе зародку, у яе спрадвечнай задуме. Калі душа абудзілася да жыцця і пачынае ўвасабляцца ў целе, гэта адбываецца на зямлі [1].

З пункту гледжання культуралагічнага падыходу, архетыпы ўніверсальныя і ўсведамляюцца людзьмі ў розных культурах і ў розныя гістарычныя перыяды. Прыкладам, архетып героя можа быць пададзены ў

выглядзе легендарнага ваяра ў адной культуры (Самурай, вікінг), ці міфалагічнай боскасці ў іншай (Арфей, Асіріс), у сваю чаргу архетыпічныя вобразы кожнага архетыпа нясуць нацыянальны адбітак культур і народаў, а ў фармаванні архетыпічных вобразаў і інтэрпрэтацыі архетыпаў вельмі важны культурны кантэкст, роля культурных каштоўнасцяў, вераванняў і практык пэўнай супольнасці.

Менавіта ў парадыгме «калектыўнага несвядомага» Карла Густава Юнга архетыпы набылі папулярнасць, і трывала занялі сваё месца ў галіне гуманітарных ведаў. У дадзеным даследаванні будзе разглядацца дэфініцыя архетып і архетыпічны вобраз ў юнгіянскай канцэпцыі. Паводле К. Г. Юнга, архетыпы — гэта ўніверсальныя сімвалічныя мадэлі паводзін грамадства і асобы, што існуюць у калектыўным несвядомым усіх людзей [2]. Юнг лічыў, што гэтыя архетыпы ёсць у несвядомым і што яны аказваюць глыбокі ўплыў на чалавечыя паводзіны і эмоцыі. У сваіх працах ён трактаваў паняцце архетып такім чынам: «ранее мы были вынуждены постулировать понятие инстинкта, определяющего или регулирующего наши сознательные действия, точно так же мы должны прибегнуть теперь к понятию фактора, определяющего виды понимания, увязав это понятие с единообразием и регулярностью наших восприятий. Именно этот фактор я называю архетипом или первообразом. Первообраз, вероятно, уместно определить как восприятие инстинктом самого себя или как автопортрет инстинкта, точно так же, как сознание — это внутреннее восприятие объективного жизненного процесса»[4].

Апроч таго, сам К. Г. Юнг прапанаваў размяжоўваць паняцце архетып і ўсё, што пазначае пэўную візуальную выяву: «Термин архетип зачастую истолковывается неверно, как некоторый вполне определенный мифологический образ или мотив. Но последние являются не более чем сомнительными репрезентациями; было бы абсурдным утверждать, что такие переменные образы могли бы унаследоваться. В сущности, архетипы являются инстинктивным вектором, направленным трендом, точно таким же, как импульс у птиц вить гнезда, а у муравьев строить муравейники»[4]. То бок,

архетып ня мае пэўнай выявы, візуальнай або антрапаморфнай, якую можна намаляваць, або выразна апісаць, надаць набор вонкавых характарыстык. Юнг піша: «Необходимо различать архетип и архетипические идеи. Архетип как таковой представляет собой гипотетическую, недоступную представлению модель, схожую с паттерном поведения в биологии. Архетипы не только возникают на этнологическом уровне как мифы, но и обнаруживаются в каждом индивиде. Они антропоморфизируют действительность там, где сознание более всего ограниченно и ослаблено, а фантазия может выйти за рамки внешнего мира» [3].

У той жа час, архетыпічны вобраз з’яўляецца крыніцай для міфалагічных уяўленняў, рэлігійных поглядаў, мастацтва. Міфалогія, як лічыў К. Г. Юнг, з'яўляецца выточным спосабам апрацоўкі архетыпаў. У гэтых культурных формах адбываецца паступовае перайначванне і асэнсаванне правобразаў, якія ператвараюцца ў архетыпічныя вобразы. Юнг вызначыў некалькі асноўных архетыпаў, кожны са сваім наборам архетыпічных вобразаў. Напрыклад, архетып анімы, што вызначае жаночы аспект мужчынскай псіхікі, часта ўвасабляецца такімі знакамі, як месяц, вада ці зямля. Архетып ценю, які ўяўляе цёмныя ці несвядомыя аспекты асобы, можа быць сімвалізаваны такімі выявамі, як змяя, цмок ці чорная птушка. Мандала — адзін з самых вядомых архетыповых выяў, вызначаных Юнгам, яна ўвасабляе сусвет і служыць знакам адзінства, цэласнасці і балансу.

Такім чынам, розніца ў вызначэнні паняткаў здаецца відавочнай: архетып – гэта ўніверсальныя для ўсіх людзей першавобразы, што існуюць ў калектыўным несвядомым, аднак не маюць візуальнай рэпрэзентацыі. Архетыпічны вобраз – гэта ўвасабленне архетыпа ў візуальнай сімвалічнай форме, са сваім наборам якасцяў і характарыстык, якія ўспрымаюцца іканічна. Архетыпічны вобраз з'яўляецца прадуктам культуры, і фармуецца пад уплывам нацыянальных асаблівасцяў і традыцый, а архетып мае агульны для ўсіх сэнс.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Комков О. Освальд Шпенглер: душа культуры и ее тайны [Электронны рэсурс] / Моноклер. – Режим доступа : https://monocler.ru/osvald-shpengler-dusha-kultury-i-ee-tajny/. – Дата доступа : 12.03.2023.

2. Сухоцкая Т.Ф. Архетыпы культуры / Т. Ф. Сухоцкая // Вучэбна-метадычны клмплекс. – Мінск, 2017. – 114 с.

3. Юнг, К. Архетыпы і каллектыўнае несвядомае / К. Г. Юнг. – АСТ, 2018. – 150 с.

4. Юнг, К. Чалавек і яго сімвалы / К. Г. Юнг. – Институт общегуманитарных исследований, 2020. – 404 с.

Остроглyяд К.Э., студент 508 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Жилинская Т.С.,
кандидат педагогических наук, доцент

**ВИРТУАЛЬНАЯ ВЫСТАВКА БИБЛИОТЕКИ ДЕТСКОЙ ШКОЛЫ ИСКУССТВ КАК ИНСТРУМЕНТ ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ТВОРЧЕСТВА КОМПОЗИТОРОВ**

Виртуальные выставки широко вошли в библиотечную практику, позиционируя себя как новый, многофункциональный информационный ресурс, предоставляющий широкому кругу пользователей возможность повысить эффективность поиска информации и расширить круг необходимых материалов (тексты, графика, аудио, видео и др.). Несомненно, что будущее библиотек тесно связано с развитием интернет-технологий в разных сферах библиотечного обслуживания и, в первую очередь, обслуживании пользователей, одной из форм которого является виртуальная выставка. Виртуальные выставки позволяют формировать и поддерживать имидж библиотеки, раскрывают содержание ее фонда, развивают и совершенствуют